*М. ГАЛАДЗЕД*

# 31 вырашае выкананьне пяцігодкі за 4 гады

Мы ўваходзім у 1931 г.—3-ці і рашаючы год пяцігодкі—з вялізарнымі перамогамі на фронце разгорнутага сацыялістычнага наступленьня. Пасьпяховае выкананьне першых 2-х гадоў пяцігодкі са значным перавыкананьнем праектаваньняў пяцігодкі па важнейшых і рашаючых галінах народнай гаспадаркі абумовіла поўную магчымасьць запраектаваць народна - гаспарачы плян на 1931 г. у значна павышаных разьмерах.

Прыняты аб'яднаным пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б) плян разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры Савецкага Саюзу на 1931 год зьяўляецца гіганцкай праграмай бальшавіцкіх работ па завяршэньні пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі. Асноўнае значэньне гэтага пляну заключаецца ў тым, што ў ім, як і ў папярэдніх плянах, якія прымаліся нашай партыяй, асабліва ярка адбіваецца пасьлядоўнае праводжаньне генэральнай лініі ленінскай партыі, лініі, разьлічанай на максымальна напружаныя тэмпы індустрыялізацыі і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі на шляху яе калектывізацыі.

Разам з адбітымі ў пляне ўстаноўкамі будзе завершана пабудова фундаманту сацыялістычнай эканомікі, але будзе зроблен новы гіганцкі крок на арганізацыі сацыялістычнага грамадзтва.

Народна-гаспадарчыя пляны БССР, прынятыя СНК і ўхвалены сэсіяй ЦВК БССР, зьяўляючыся часткай агульнага Саюзнага пляну, таксама вызначаюць вышаныя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР, якія далёка перавышаюць праектаваньні пяцігодкі.

Вынікі гаспадарчага будаўніцтва БССР за першыя 2 гады пяцігодкі са значным перавыкананьнем праектаваньняў далі магчымасьць праектаваць кантрольныя лічбы разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры БССР на 1931 год у такіх разьмерах, якія поўнасьцю забясьпечылі-б выкананьне лёзунгу «Пяцігодка—за 4 гады».

Канкрэтныя задачы, якія перад намі стаяць, заключаюцца ў тым, што мы павінны працу арганізаваць, так, каб поўнасьцю забясьпечыць выкананьне кантрольных лічбаў, вызначаных на 1931 год.

Асноўную ўвагу ва ўмовах БССР мы павінны канцэнтраваць на далейшым узмацненьні вядучай ролі прамысловасьці, [illegible] разьвіцьця сельскай гаспадаркі БССР накіроўваецца на шляху разьвіцьця жывёлагадоўлі і тэхнічных культур, нашай асноўнай задачай зьяўляецца вырашэньне іменна гэтай праблемы—праблемы жывёлагадоўлі і разьвіцьця ільнаводзтва і малочнаводзтва. У працы па далейшай калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак неабходна выходзіць з абавязковай спэцыялізацыі як існуючых, так і новых калгасаў і саўгасаў і іменна ў вышэйпаказаным напрамку. Трэба памятаць, што разьвіцьцё жывёлагадоўлі зьяўляецца адным з асноўных элемэнтаў палепшаньня харчовага забесьпячэньня рабочае клясы і ўсіх працоўных мас.

БССР павінна ператварыцца ў рэспубліку ўзрастаючай сацыялістычнай прамысловасьці, жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў, саўгасаў і калгасаў тэхнічных і працаёмкіх культур. Гэта задача абавязкова для ўсёй партыйнай і савецкай грамадзкасьці. Мы павінны ўжо ў 1931 г. зрабіць БССР рэспублікай буйных сацыялістычных фабрык, жывёлагадоўлі і тэхнічных культур.

Зусім зразумела, што дадатнія вынікі [illegible] з вялікімі труднасьцямі, на пераможваньне якіх мы павінны мабілізаваць максымальную ўвагу ўсёй пралетарскай, партыйнай і савецкай грамадзкасьці.

Вопыт мінулых гадоў паказаў, што рабочая кляса і наша пралетарская дзяржава маюць нязьмерна вялікія крыніцы энэргіі, мабілізаваўшы якія мы можам рухаць сацыялістычнае будаўніцтва нячувана вялікімі тэмпамі. Таму нашай задачай зьяўляецца мабілізаваць усе гэтыя скрытыя энэргетычныя і матар'яльныя рэсурсы на пасьпяховае выкананьне народна-гаспадарчага пляну 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Задачы вызначаны гіганцкія. Іх выкананьне магчыма толькі пры тых умовах, калі ўся рабочая кляса і ўсе савецкія і гаспадарчыя арганізацыі, увесь савецкі апарат зьверху да нізу будуць праводзіць выразную клясавую лінію, лінію ленінскай партыі. Таму праца ўсіх савецкіх і гаспадарчых органаў і савецкага апарату, які зьяўляецца асноўным інструмэнтам дзяржавы пралетарскай дыктатуры і які павінен выразна праводзіць лінію нашай партыі,

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы